Вельмі высокую адзнаку кнізе даў А.Мальдзіс: ён падкрэсліў, што на Беларусі гэта першая такая кніга, у якой распавядаецца пра радавод простай сям'і беларускага (у мінулым прыгоннага) хлебароба, бо ў радаводзе Целешаў ніколі не было прадстаўнікоў шляхты ці іншага высокага саслоўя.

У будучым Вячка Целеш плануе арганізаваць прэзентацыю кнігі ў Мінску і на сваёй малой радзіме — на Ваўкавыдчыне.

На развітанне я сфатаграфаваў нашага земляка. Першая мая сустрэча з Вячкам Целешам адбылася 20 год таму ў Рызе. Тады высветлілася, што мы не сваякі, а толькі цёзкі па прозвішчы.

У сваім артыкуле мне хочацца адзначыць высокія чалавечыя якасці Вячкі Целеша: яго чуласць, інтэлігентнасць, уважлівае стаўленне да іншых. Сведчаннем гэтага з'яўляецца тое, што 5 год таму ён паштоўкай з Рыгі запрасіў мяне, не маючага адносін да мастацтва, на прэзентацыю выставы сваёй графікі, якая адбывалася ў мінскай кавярні фальварка "Добрыя думкі". Выставу я наведаў тады разам са сваёй жонкай Людмілай і ўнучкай Алёнай, у якіх і сёння засталіся добрыя ўражанні і аб выставе, і аб мастаку.

А нарадзіўся Вячаслаў Міхайлавіч 25 верасня 1938 года ў пасёлку Красносельскі, што на Ваўкавыдчыне. У 1958 годзе 20-гадовым хлопцам ён паехаў у Латвію, каб уладкавацца на працу, ды і застаўся там на ўсё жыццё. У 1975 годзе скончыў Латвійскую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Зараз Вячка Целеш — адзін з вядомых людзей Латвіі. Мастак працуе ў такіх жанрах, як партрэт, нацюрморт, пейзаж, экслібрыс, графіка, і многія свае творы прысвяціў Ф.Скарыну, Я.Купалу, В.Дуніну-Марцінкевічу, Я.Райнісу. Стварыў ён і серыю экслібрысаў такіх выдатных дзеячаў гісторыі, літаратуры і культуры Беларусі, як Рыгор Барадулін, Уладзімір Караткевіч, Зоська Верас, Адам Мальдзіс і іншыя. Ва ўсіх творах мастака адчуваецца магічнае цяпло роднай Бацькаўшчыны — Беларусі.

У 2006 годзе ўрад Латвіі ўзнагародзіў нашага земляка вышэйшай узнагародай Латвійскай Рэспублікі — ордэнам Трох Зорак. Імя яго ўнесена ў 80-томную Сусветную энцыклапедыю мастакоў усіх часоў і народаў. За плячыма Вячкі Целеша звыш 100 выстаў у розных краінах свету. У свой час мастак падтрымліваў добрыя сяброўскія адносіны з пісьменніцай Зоськай Верас і выдатнай беларускай паэткай Ларысай Геніюш.

Жывучы ў Латвіі, Вячка Целеш ніколі не адрываўся ад Радзімы, жыў у адным рытме з ёй. Так, ён заснаваў у Рызе беларускую школу, якая існуе там больш за 20 год, і быў у ёй першым дырэктарам. Тады шмат хто казаў Вячку Целешу: "А навошта тая беларуская школа? Хопіць рускай і латышскай". На што мастак адказваў, што ён беларус і хоча, каб прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Латвіі не забывалі матчыну мову.

Урад Латвіі ўзнагародзіў Вячку Целеша вышэйшай узнагародай, а чаму б нашаму ўраду не ўзнагародзіць яго ордэнам Францыска Скарыны? Лічу, што мастак заслугоўвае такой высокай узнагароды і маю прапанову падтрымалі б тысячы нашых суайчыннікаў.

На развітанне я сфатаграфаваў Вячку Целеша і прашу змясціць яго фота на старонках газеты. У гутарцы ён сказаў, што "Народная Воля" адна з любімых яго газет.

Напаследак хочацца ад душы павіншаваць Вячку Целеша з яго юбілеем — 75-годдзем з дня нараджэння і пажадаць яму моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця і новых творчых поспехаў на ніве мастацтва, педагогікі, літаратуры! "Народная Воля" і чытачы заўсёды з Вамі, паважаны Вячаслаў Міхайлавіч!

Лявон ЦЕЛЕШ.

г.Дзяржынск.



Вячка Целеш на Прывакзальнай плошчы Мінска 20 верасня 2013 года.

ТАК ДУМАЮ

Водные запасы богаты, а нормативы — зажаты...

Читатели "Народной Воли" приняли активное участие в обсуждении лимита на воду. Получается, в богатой на воду стране нормативы зажаты вдвойне. В советские добрые времена норма была где-то под 300 литров в сутки, а теперь — около 140. И еще планируют ее уменьшить. Потребителям это не нравится. Минимальные нормативы загоняют людей в антисанитарию. Так можно докатиться и до какой-нибудь еще неведомой чумы...

Считаю, что уменьшение норматива вводится не столько для экономии воды, сколько для того, чтобы сорвать с населения еще больше денег за воду.

Может, белорусским властям стоило бы изучить вопрос о продаже питьевой воды тем странам, где ее не хватает, а не печалить население зажатием нормативов?

Питьевая вода в Беларуси — это белорусская "нефть". В России от нефтяной прибыли — в разы большие зарплаты и пенсии, чем у нас. Почему же у нас не используют возможности белорусской "нефти"?

С уважением —

Иван КАЧУР.

Минск.



НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ

Не апаліцеся!

Паважаныя чытачы "Народнай Волі"!

Звяртаюся да вас, каб вы не апякліся, як я, на запалках. Тактак, звычайных запалках, без якіх нікк не абысціся.

Я жыву ў старым доме. І калонку трэба часта ўключаць, і газавую пліту. Аднойчы купіла дзве ўпакоўкі запалак — загорнутыя ў празрыстую плёнку, а самі пачачкі зусім маленькія, ды і запалак там, здаецца, 35 ці троху болей. Ну ніяк не атрымліваецца распаліць пліту ці калонку з першага разу — трэба змарнаваць 3—4 запалкі!

"Можа, я такая няўмека?" — падумалася мне. Аднак і брат, які прыехаў да мяне ў госці, таксама раззлаваўся: "Дзе ты такія запалкі купіла?!" Добра, пакуль ён у мяне, карыстаецца запальнічкай для цыгарэт, каб запаліць пліту ці калонку. А калі ён з'едзе, што мне рабіць?

Выпускае такую прадукцыю запалкавая фабрыка ЗАТ "Пінскдрэў". Вось і хачу запытацца ў вытворцаў: што гэта — тэхналагічны брак, ці, можа, па дарозе ў краму не былі вытрыманы ўмовы захоўвання?

Вельмі хочацца, карыстаючыся беларускай прадукцыяй, ганарыцца, а не нервавацца.

Валянціна МЯДЗВЕДЗЕВА.

ВАС ЦІКАВІЦЬ

За бясплатнымі ведамі...

Чула, што ў Мінску будуць арганізаваны бясплатныя курсы і семінары з удзелам вядомых навукоўцаў. Ці так гэта?

А.АТРОШЧАНКА, Мінск.

Так, 13 верасня была абвешчана праграма Лятучага ўніверсітэта на 2013—2014 гады. У межах праграмы прапануюцца базавыя і тэматычныя курсы, будуць працаваць некалькі школ майстэрства знакамітых культурных дзеячаў і інтэлектуалаў: "Школа Біблії" Ірыны Дубянецкай, D2 Міхала Анемпадыстава, "Нетрафарэтнае праектаванне" Ігара Герасіменкі, "Літаратурныя чытанні" з Валянцінам Акудовічам, "Герменеўтычныя доследы культуры" Паўла Баркоўскага.

Падаць заяўку і знайсці больш падрабязную інфармацыю пра семінары, курсы і школы можна на сайце Лятучага ўніверсітэта **fly-uni.org.**

РЭЗАНАНС

Вы перегнули, товарищи прапорщики!

Уважаемая редакция!

Всегда охотно читаю "Народную Волю". И с материалами, опубликованными в номере за 10 сентября, не преминул ознакомиться. Особенно задела меня коллективная заметка "Старшим офицерам и генералам и черт дитя колышет" (странный, не правда ли, заголовок?). Я сам являюсь старшим офицером в отставке, имею 32 календарных года службы в Вооруженных Силах СССР. И, как старший офицер, считаю своим долгом заметить и напомнить подписавшим письмо прапорщикам, что в приличном обществе заглядывать в чужие кошельки и карманы по меньшей мере неприлично. Это первое.

Второе: хотелось бы напомнить им, что армия, в которой они служили, организм особый, со своей спецификой и служебной иерархией, где все было подчинено служению Родине, защите ее от внешнего противника, беспрекословному выполнению приказов, нравились они кому-то или нет. Армия в СССР имела свою структуру, основой которой являлось деление на категории: рядовые, сержанты, прапорщики, младшие, старшие и высшие офицеры. На каждую категорию были возложены соответствующие служебные обязанности и степень ответственности по занимаемой должности, естественно, с материальным и финансовым обеспечением даже при выходе в запас и отставку.

Уже исходя из этого, как можно ставить знак равенства в пенсионном обеспечении между прапорщиками и старшими офицерами? По каким критериям? По уровню образования? Что-то не встречал прапорщиков с высшим образованием — у них оно было всегда среднее, среднее специальное или среднее техническое.

Занимаемые должности? Да самые различные, в основном начальники складов различного профиля и назначения (скажем, у зав.продовольственным или вещевым складом работа далеко не черновая). Высокая степень ответственности? Разве что у авиационных механиков и воздушных стрелков-радистов. При переводе к новому месту службы прапорщик мог и отказаться от предложения, зато в группах войск за рубежом во времена СССР они служили по десять и более лет и домой на родину их и калачом было не заманить. За подвиги, кроме благодарностей, не награждались орденами и медалями? Не скажите. Кто прошел Афган, Анголу, Ближний Восток — те ими отмечались. Кстати, благодарность и грамота — тоже поощрения.

А вот степень ответственности у старших офицеров и генералов несколько иная, чем у прапорщиков, значительно выше. К примеру, у командира зенитно-ракетной бригады, в подчинении которого от 6 до 15 дивизионов, всегда была и есть высочайшая ответственность за состояние боевой готовности, воинской дисциплины, обученности подчиненных, морального состояния солдат, сержантов, прапорщиков, младших и старших офицеров и другое. Не говорю о генералах — командирах дивизий, корпусов, командующих армиями. Конечно же, денежное довольствие этих категорий старших офицеров и генералов должно быть гораздо выше, чем у прапорщиков. Это касается и пенсионного обеспечения при увольнении в запас или отставку.

Перегнули уважаемые подписанты и по поводу 85-процентного повышения пенсий старшим офицерам и генералам — их повысили всего на 40 процентов. Несолидно пользоваться слухами и досужими вымыслами "сведущих людей" о том, что деньги на пенсии военнослужащим дала Россия. Там своих проблем много, хотя российские пенсионеры получают в два-три раза большие пенсии, чем у нас. Если вы выступаете с письмом-обращением, то потрудитесь проверить слухи и вымыслы в своем военкомате или Минском облвоенкомате. Да, несколько лет назад, до мая—июня 2011 года, пенсии военных были более или менее приличные, но случилось то, что случилось, в том числе и наши пенсии рухнули в два-три раза. Кто в этом виноват, не знаю.

Кстати, наш народ знает о размерах военных пенсий, ибо военные — часть народа, который понимает те тяготы и лишения военной службы, с которыми военнослужащие сталкиваются в повседневной жизни. Быть радетелем сирых и убогих — дело благородное. Но подписанты только выдают себя за радетелей. А вот кивать на старших по званию — дело неблагородное и неблагодарное. Прежде чем растачать жалобы в газеты, надо взглянуть на себя и спросить: "А что я привнес в дело защиты Родины, какой сделал вклад?"

Честь имею —

Ю.КУКОВСКИЙ, полковник в отставке.

г.Борисов.



ГЛАС НАРОДА

Некоторые претенденты в президенты кажутся «дробненькими» даже внешне!

Вот уже который год ведутся разговоры о выдвижении единого кандидата на президентских выборах. Спорам-разговорам нет конца! Похоже, что единственный кандидат на пост президента от оппозиции не будет определен и на выборах 2015 года...

На мой взгляд, претендентам на президентский пост нет необходимости сочинять схожие предвыборные программы. Вместо программ (их можно озвучить после победы на выборах) каждая партия в ходе избирательной кампании должна предпринять все возможное, чтобы довести до каждого избирателя полный текст статьи юриста **Гарри Погоняйло *"Почему Лукашенко не имеет права баллотироваться кандидатом в президенты Республики Беларусь"*,** опубликованной в "Народной Воле" в сентябре 2010 года. Эта статья ценнее любых листовок!

При всем моем критическом отношении к А.Лукашенко, если бы создалась безвыходная ситуация, при которой я должен был бы отдать свой голос либо за него, либо за Гайдукевича, то я бы проголосовал за... Александра Григорьевича. Ибо в данном случае хотя бы знаю, чем он дышит, куда клонит, чего от него можно ожидать завтра и послезавтра.

Думаю, если бы Лукашенко отказался от дальнейшего участия в президентских выборах, то вместо потерявших авторитет у народа лидеров оппозиционных партий свои кандидатуры выдвинули бы другие авторитетные люди. Сегодня они предпочитают не выходить из тени, чтобы не попасть в число агентов "пятой колонны" и даже в число врагов народа. Тут, наверное, уместно вспомнить о судьбе бывшего премьер-министра **Сергея Сидорского**. Как только накануне минувшей президентской кампании избиратели обратили на него внимание, а в независимой прессе, в том числе и в "Народной Воле", появилось несколько материалов о нем как о возможном сменщике Лукашенко, его сразу отправили подальше с глаз. Хорошо, что еще обошлось без печальных криминальных последствий!

На мой взгляд, при определении "единого" надо иметь в виду еще и устоявшийся его имидж, то, какое впечатление он произведет на избирателей. Например, некоторые претенденты на пост президента кажутся "дробненькими" даже внешне!

И еще всем политикам нужно помнить главное: доверие избирателей завоевывается не красивыми словами, а конкретными делами!

Михаил ЖУКОВ, 87-летний ветеран труда советского времени.

г.Барановичи.

ПАРАЛЕЛІ

Такая розная старасць

Я вось думаю: няўжо актыўны лад жыцця людзей сталага ўзросту і з абмежаванымі магчымасцямі здзяйсне толькі нас, грамадзян "сацыяльна арыентаванай" дзяржавы? У Ізраілі, які наведала гэтым летам, мяне ўразіла вялікая колькасць старых на вуліцах у любы час дня. Прычым праблемы з апорна-рухальным апаратам ніякім чынам не ўплываюць на іх актыўнасць. У раніншні гадзіны ў любым вулічным кафэ своеасаблівыя клубы па інтарэсах пажылых людзей — у інвалідных калясках, з хадункамі, а падчас і з кіслародным балонамі... Побач паседжваюць, часцей за ўсё ўтаропіўшыся ў мабільныя тэлефоны, тыя, хто іх суправаджае, — па большай частцы філіпінкі, украінкі, малдаванкі.

Я спрабую ўявіць: як бы гэтай бабулі жылося ў Беларусі?

Аляксандра БАТУРЫНА.

Мінск.



З НАТУРЫ

Ах, парыжанкі! Вам і не снілася...

Вы не паверыце, але на пачатку верасня для дзятлаўскіх пенсіянераў быў проста клондайк: на ўборцы бульбы за дзень маглі зарабіць каля двухсот тысяч рублёў! Бліжэйшыя да райцэнтра калгасы і на поле аўтобусам завозілі, і дадому прывозілі. Камсамолкі шасцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя ўспомнілі маладосць і дружна рынуліся на палеткі.

— Паехалі і мы! — з энтузіязмам прапанавала неяк сяброўка.

— Гэта ж падумаць, за пяць дзён можна зарабіць амаль усю мільён! Вунь жа Каця ездзіць ужо каторы дзень, а мы што, горшыя?

— Твая Каця маладая, ёй яшчэ і 60-ці няма, — нагадваю сяброўцы пра яе суседку. — А мы ж старэйшыя.

— Ну дык і што? Казалі, што Ануфрыеўна з вуліцы Леніна таксама ездзіць, а ёй жа ўжо хутка 75.

Сяброўка ўстала з-за стала, каб памяшаць у каструльцы суп. Крэхчучы і трымаючыся за спіну, пашкандыбала да газавай пліты.

— Як жа ты паедзеш, калі табе спіна баліць?

— Ну, дык абязболю ібуклінам і з сабой яго вазьму. У кішэню таксама трэба браць валідол, карвалол, таблеткі ад крывянога ціску. У мяне іх да халеры. Між іншым, усе так робяць. Старыя ж усе, а зарабіць хочацца, бо якія тут у нас пенсіі, а выдаткаў да злой моцы, цэны на ўсё-ўсякае такія, што і запамінаць не паспяваеш.

У кабет, якія пастаянна ездзяць на бульбу, мы даведаліся пра месца сустрэчы, бо кожны дзень калгасны аўтобус адпраўляецца з аднаго і таго ж пункта, як мае быць экіпіраваліся і раненька былі на пункце збору. Думалі, што будзем першыя, аднак некаторыя ўсталі яшчэ раней. З кошыкамі, пакетамі з ежай плот падпіралі поўныя энтузіязму бабулі. Крыху воддаль курылі мужчыны.

— Джэнтльмены, мабыць, кошыкі носяць да машын? — пацікавіліся мы.

— Носяць, але, бывае, усім не паспяваюць, так што трэба і самім. Набіры, занясі, на машыну падай. А калі яны паедуць бульбу выгружаць, то пакуль вернуцца, самі цягаем. Нічога, мы ўжо прывыклі!

— Казалі, што на палетку ўсе вельмі прушча, дух няма калі перавесці?

— Прушча, а як жа, бо ўсе хочуць зарабіць. Якраз сезон, праз месяц заробку ўжо не будзе.

Нас з сяброўкай адолелі сумненні: ці справімся мы за гэтымі стаханаўкамі, вельмі ж яны энергічныя, поўныя энтузіязму? У нас ён знік...

Разважаць не было калі, бо прыйшоў аўтобус. А на полі ўжо чакалі вытрасеныя клубні. Там, дзе вышэй, клубні былі важкія, а ў нізіне — бараболькі. І то сказаць, надвор'е сёлета не спрыяла аграрыям, пра гэта ўсе ведаюць.

На барознах ужо завіхаліся нейкія людзі.

— А гэта хто такі ранні? — пацікавілася сяброўка ў нейкага мужчыны.

— Людзі са Столінскага раёна. Прыехалі да нас у заробкі.

— Глянь ты, мы, аказваецца, можам ганарыцца: да нас ужо з іншых мясцін у заробкі едуць! — пачала было жартаваць сяброўка, але яе перапыніў зычны жаночы голас. Кабета, відаць, была тут камандзірам:

— На гэтыя рады не станавіцеся, ідзіце туды, у нізінку. Гэтыя рады для столінцаў.

— А мы чым горшыя?

— Колькі ж мы заробім на той драбязе?

— Сціхніце, жанчыны, столінцы ў нас госці, а гасцям трэба аддаваць усё лепшае!

Спрэчка закончылася, і кабеты дружна ўпліснуліся ў баразны. Было такое ўражанне, нібы ім скамандавалі: старт!

...Мы ледзь датрывалі да поўдня.

— А няхай яно спрахне! Мяне ўжо і абязбольванне не бярэ, — паскардзілася адна кабета, калі селі перакусіць. — Дурная, чаму я дачку не паслухала? Казала ж мая Таня: "Сядзі дома, бо твайго заробку потым на лекі не хопіць!" Дык жа не, не паслухала.

— А вы ўжо які дзень тут працуеце? — пытаюся.

— Другі і апошні. Каб хоць датрываць да вечара, а то ж брыдка звязаць з поля раней за ўсіх.

— Што тут брыдкага? Калі не можаце, то і кідайце.

— Не сёлета, а гады тры таму да адной такой капальнічыцы на поле "хуткую дапамогу" выклікалі. Думалі, памрэ, так ёй стала дрэнна. А ўчора тут з намі Віхця працавала. Некалі яна ў садку дзетак даглядала. То ўсяго адзін дзень і адолела. Казала, што больш не пойдзе, хоць спачатку таксама хацела зарабіць.

— Ого, тут трэба каменнае здароўе! — пасля ўчарашняга энтузіязму заявіла мая сяброўка, нібы шарык, з якога выпусцілі паветра.

— А ніхто вас сюды не пёр! — упляточыўшы хлеб з салам, прагугніла чырванашчокая бабуля.

— Мне вось хутка 74 гады будзе, а я не ныю, ужо тыдзень езджу сюды дзень у дзень. А вы, так бы мовіць, не паспелі абагрэцца — і ўжо ўхайдокаліся. Дома трэба было сядзець!

Калі мы, падсілкаваўшыся, сталі ў барозны, я падумала: ах, парыжанкі, ды італьянкі, ды немкі! Нашы равесніцы, што, пайшоўшы на пенсію, гойсаюць у пошуках уражанняў па ўсім свеце! Вам і не снілася, як бавім час на заслужаным адпачынку мы, камсамолкі 60-х гадоў. Да нас бы прыехалі, паглядзелі, колькі маем нерастрачанага энтузіязму, бадзёрасці! І нічога, што кішэні каптаноў адтапырваюцца ад розных лекаў. Затое душу саграваюць думкі аб велізарных заробках — амаль 20 долараў у дзень! Гэта вам не жартачкі, калі пенсія ў многіх 170 долараў.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

ГОРАД БУДУЧЫНІ

Архітэктары больш не жадаюць нічога хаваць ад мінчан

Падчас прэзентацыі праграмы X Нацыянальнага архітэктурнага фестывалю “Мінск-2013” старшыня Беларускага саюза архітэктараў Аляксандр Корбут прызнаўся, што грамадзяне маюць шмат прэтэнзій да дойлідаў. Апошнія і рады былі б дзяліцца інфармацыяй, але на адкрытасць часам проста не хапае грошай...

Змрочныя цені

Сустрэцца з журналістамі прадстаўнікі Саюза архітэктараў вырашылі з даволі прыемнай нагоды — у сталіцы распачаўся юбілейны X Нацыянальны архітэктурны фестываль. Нягледзячы на ўвесь пазітыў сітуацыі, над выступоўцамі навісаў чорны цень гатэля “Кемпінскі”, які ўзрастае ў самым цэнтры сталіцы. У калясархітэктурных колах гэта самая гарачая тэма апошняга часу. Каб прадухіліць неагучаныя вострыя пытанні наконт аб’екта, які, па меркаванні многіх спецыялістаў і простых грамадзян, разбурае гістарычны выгляд горада, мадэратары сустрэчы папярэдзілі — гаворым толькі аб фестывалі. Але грэх не схаваць у мех, і на слізкую тэму ўсё ж такі выйшлі. Старшыню саюза **Аляксандра Корбута** папрасілі выказаць сваё меркаванне: ці не лічыць ён, што Беларусі жыццёва неабходна ўвесці спецыяльную прэмію для самых няўдалых архітэктурных рашэнняў?

“У іншых краінах ужо ёсць такі вопыт, — выказаўся Аляксандр Іосіфавіч. — *Антыпрызы ўручаюць за кінафільмы, музычныя творы. Зрэшты, чаму б і не? Я лічу, што нам не зашкодзіў бы спіс на сайце нашага саюза, куды заносіліся б дадзеныя несумленных праекціроўшчыкаў, інвестараў, забудоўшчыкаў і гэтак далей. Думаю, ад гэтага было б лепш усім”*.

Знаны архітэктар прызнаў, што апошнім часам людзі сапраўды маюць да прадстаўнікоў яго цэха шмат пытанняў. На жаль, наладзіць зручную камунікацыю пакуль не атрымліваецца. Вось і ў межах архітэктурнага фестывалю звычайныя грамадзяне застануцца без “салодзенькага”. З-за фінансавых праблем арганізатарам прыйшлося адмовіцца ад вялікай выставы дасягненняў. А задума была цудоўная — сучасная і стыльная выстава праектаў-пераможцаў 16 фестываляў. Размясціць усю гэтую прыгажосць думалі наўпрост на вуліцы Карла Маркса акурат каля офіса Беларускага саюза архітэктараў. За савецкім часам такія выставы былі абавязковым пунктам праграмы і збіралі натоўпы зацікаўленых гледачоў.

“Апошнім часам у грамадзян ёсць прэтэнзіі да архітэктараў, і дыялог нам проста неабходны, — заявіў архітэктар. — *Многім падаецца, што мы нешта хочам прыхаваць, але на самай справе гэта зусім не так”*.

Дарогу моладзі!

Хоць для звычайных гараджан у праграме фестывалю і не запланавана спецыяльных мерапрыемстваў, цікавінак хопіць на ўсіх. Нельга абмінуць увагай Рэспубліканскі конкурс на лепшы архітэктурны твор 2012—2013 гадоў. У мінулым годзе самым-самым прызналі новы офіс Беларускай калійнай кампаніі. А вось хто пераможа ў гэтым — пакуль загадка. Арганізатары, напрыклад, прызналіся, што да адкрыцця форуму і ведаць не ведалі, хто падаў заяўкі на конкурс. Дарэчы, абірае лепшых міжнароднае журы, так што ніякіх падтасовак — на гэтых выбарах міжнародныя назіральнікі ў пашане.

Вось ужо пяць гадоў вялікай папулярнасцю карыстаюцца выставы Міжнароднага конкурсу маладых архітэктараў “Леанарда”. Мінулай восенню ў адным з праектаў удзельнічалі жывыя трусы, а на іншых стэндах раздавалі пачастунак. Мінскі конкурс для моладзі карыстаецца надзвычайнай павагай па ўсім свеце. У мінулым годзе на конкурс прадставілі 360 праектаў з 30 краін свету.

Стаць уладальнікам гран-пры “Леанарда” вельмі прэстыжна. Праўда, прызавы фонд не такі ўжо і вялікі — адносна сціплыя 1,5 тысячы долараў. Але і гэта няблага, асабліва калі ўлічыць, што ў “дарослым” конкурсе грашовы прыз увогуле не прадугледжаны.

У межах фестывалю адбудзецца яшчэ два конкурсы — студэнцкіх работ і дзіцячых малюнкаў. А яшчэ запланавана мноства розных цікавых сустрэч, майстар-класаў, семінараў. Напрыклад, былы галоўны архітэктар Масквы **Аляксандр Кузьмін** прачытае лекцыю “Як стаць галоўным архітэктарам Масквы”. Арыгінальна, праўда?

Асноўная пляцоўка фестывалю — сталічны Палац мастацтва. Насычанае архітэктурнае жыццё будзе віраваць там **па 28 верасня**, а некаторыя выставы працягнуцца некалькі дзён.

“Мы настойвалі на тым, каб уваход быў бясплатным для ўсіх, так што запрашаем на фестываль усіх цікаўных”, — выказаўся Аляксандр Корбут.

Марыя МАЛЕВІЧ.

ПАРАЛЛЕЛИ



Сравним два фото. На первом — замок площадью в 1300 квадратных метров, который расположен на 24 акрах (9,7 гектара) земли в Пиринеях, на юге Франции. Внутри имеется огромный холл, двери которого ведут на внутренний двор, гостиная с камином, парадная лестница, лифт, просторная столовая тоже с камином, две кухни, спальное крыло с собственным холлом, выходящим на внутренний двор, студии в башенках, два гаража и часовня в восточном крыле.



На втором снимке — коттедж в Ждановичах под Минском. 425 квадратных метров с отделкой VIP-класса. 4 спальни, гардеробные, кабинет, постирочная, гараж на 2 автомобиля. Витражи с конвекторами, камин дизайнерской работы, деревянные стеклопакеты из лиственницы...

Стоимость замка во Франции, выставленного на продажу, 1 миллион 770 тысяч долларов. Стоимость выставленного на продажу коттеджа под Минском — 1 миллион 850 тысяч долларов.

И для Беларуси такая стоимость коттеджа не нечто вопиющее. Скорее даже наоборот. Коттеджи в самом Минске стоят еще дороже. Например, коттеджи, которые построены в Дроздах, выставляются на продажу крайне редко, но когда появляются — цена от 2 миллионов долларов и выше. Откуда такие цены? Откуда такие деньги?

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Праект рэалізаваны поўнасцю

У “Народнай Волі” №68 (3809) за 30 жніўня быў надрукаваны матэрыял Вадзіма Мажэйкі **“Беларускія бібліятэкі захраслі ў мінулым стагоддзі”**, дзе шла размова пра рэформы ў бібліятэчнай справе.

Міністэрства інфармацыі не пагадзілася з некаторымі думкамі аўтара і выклала свой пункт гледжання на гэты конт:

“Прадугледжаны Дзяржаўнай праграмай інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь на 2003—2005 гады і на перспектыву да 2010 года “Электронная Беларусь”, якая зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2002 г. №1819, праект па стварэнню на базе Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі інфармацыйнай сістэмы дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі (пункт 93 пераліку праектаў) быў рэалізаваны поўнасцю.

Дадзены праект планаваўся да рэалізацыі і быў рэалізаваны фактычна як самастойны праект і да стварэння карпаратыўных бібліятэчных сетак ніякага дачынення не мае.

Карыстальнікамі інфармацыі, якая размешчана ў сістэме, з’яўляюцца аўтарызаваныя і неаўтарызаваныя юрыдычныя і фізічныя асобы.

На сайце Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі (http://natbook.org.by) размешчана спасылка на электронны каталог інфармацыйнай сістэмы дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі (http://natbookcat.org.by/isgbi), якая забяспечвае аддаленым карыстальнікам доступ да рэсурсаў дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі Беларусі, а аўтарызаваным карыстальнікам — магчымасць самастойна фарміраваць запыты і атрымліваць неабходную інфармацыю з базы даных.

Акрамя таго, інфармацыйная сістэма дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі забяспечвае аўтаматычную бібліяграфічную рэгістрацыю ўсёй кніжнай прадукцыі і сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, як і было паведамлена ў 2011 годзе Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі”.

КАКИЕ РЕФОРМЫ НУЖНЫ БЕЛАРУСИ

Голоса станут считать по закону, когда запахнет жареным

Нашумевшие поправки в Избирательный кодекс поступили в Палату представителей. Эксперты отмечают их технический характер, нежелание властей прислушаться к ключевым рекомендациям критиков .

Вместе с тем проблема с белорусскими выборами куда серьезнее несовершенных законов. Она — в отсутствии у государства политической воли провести выборы честно и в неспособности общества эту волю сформировать.

Косметика в интересах чиновников

Текст законопроекта, планируемого к рассмотрению в начале октября, на самом старте осенней сессии парламента, по-прежнему недоступен общественности. О его содержании можно судить лишь по опубликованной пояснительной записке.

Итак, планируется проводить выборы депутатов Палаты представителей в один тур по принципу относительного большинства. Теперь кандидатам нет необходимости набирать более 50%. Точнее — избиркомам нет необходимости подавать такие цифры в ЦИК, достаточно перевеса в один голос.

Вдобавок к Центризбиркому, окружным и участковым комиссиям создается еще одно промежуточное звено — территориальные избиркомы (в Минске и шести областях). Эксперты считают, что это снизит поток жалоб в ЦИК, где они обычно оказываются в поле зрения множества международных наблюдателей.

Расширяются возможности использования избирательных фондов на местных и президентских выборах, также разрешается формировать эти фонды со времени регистрации инициативной группы (а не кандидата, как это было раньше). Однако кандидаты лишаются бюджетного финансирования на изготовление печатной агитации.

Эта новелла ставит перечисление пожертвований кандидатам под полный контроль, включая личные данные жертвователей. Велик риск, что некоторые альтернативные кандидаты просто не смогут найти денег на кампанию, учитывая страх бизнеса и населения финансировать оппозицию и запрет на использование иностранной помощи.

Долгожданная для чиновников поправка — кандидатам в депутаты от оппозиции запретят агитировать за бойкот. Некоторые альтернативные кандидаты использовали эту возможность на предыдущих парламентских выборах, хотя их выступления с такими призывами зачастую подвергались цензуре.

Интересным элементом нового пакета изменений станет разрешение обжаловать действия избиркомов напрямую в суд (вместо того чтобы жаловаться в вышестоящую избирательную комиссию). Эта мера фигурировала в последних рекомендациях наблюдателей ОБСЕ.

“При этом суды еще более контролируемы, чем избиркомы”, — замечает политолог **Юрий Чаусов**. По сути, часть критики заблаговременно отводят от избирательных комиссий на суды, уже выходящие за рамки компетенции европейских наблюдателей.

Таким образом, власть ожидаемо не пошла на реформирование самых проблемных моментов избирательного процесса, проигнорировала требования ликвидировать или хотя бы упорядочить досрочное голосование, расширить права и состав наблюдателей, обеспечить прозрачность подсчета голосов и другое.

Поправки на деле оказываются весьма сомнительными с точки зрения демократизации выборов. Юрий Чаусов убежден: *“Основной интенцией была ликвидация тех лазеек, которыми оппозиция пользовалась в предыдущих избирательных кампаниях”*.

Власть обезоруживает оппонентов

В это же время добиваться свободных выборов решил провозглашенный в Минске 22 сентября Гражданский альянс за справедливые и честные выборы для лучшей жизни “Талака”. На первых позициях в нем Объединенная гражданская партия и Белорусская партия левых “Справедливый мир”.

Многие критикуют это объединение за нереальность целей: инициаторы хотят заставить власть считать голоса хотя бы так, как это делали в конце советской эпохи или при раннем Лукашенко. Причем пути достижения этой заветной цели пока не известны.

А власть тем временем, подготовив законодательные изменения, напомнила о своем отношении к выборам и перспективам их демократизации. Этот подход не оставляет оппонентам иллюзий.

К слову, готовятся новые палки в колеса и оппозиционной кампании “Народный референдум”. Согласно пояснительной записке к законопроекту, предусмотрено окончательно запретить выносить на референдум вопросы, связанные с бюджетной политикой государства. Теперь запрет коснется не только налогов, но также пошлин и сборов.

Запрет обсуждать на референдуме бюджетную политику может сильно осложнить инициаторам “Народного референдума” планы задать народу вопросы, связанные с такими социально-экономическими темами, как образование и здравоохранение.

Буква закона решает далеко не все

При этом вполне очевидно, что проблемы честности выборов связаны не только с плохими законами. *“Многие наблюдатели говорят, что белорусское законодательство в области выборов, в принципе, неплохое”*, — считает Юрий Чаусов.

Согласен с ним юрист **Сергей Альфер**: *“Чтобы здесь у нас выборы были свободными, нужно не столько улучшение законодательства, сколько общее желание всех политических субъектов, участвующих в выборах, в первую очередь того, кто находится у власти”*.

Вдобавок к этому, отмечает эксперт, в странах со слабыми демократическими традициями и институтами *“требуется серьезное влияние населения, гражданского общества на власть с целью понудить ее к учету интересов граждан”*.

А до тех пор власть может с легкостью выполнять часть рекомендаций ОБСЕ, набирая на этом некоторые имиджевые очки, но не меняя сути избирательного процесса.

То же самое будет относиться и к рекомендациям в рамках “Европейского диалога о модернизации с Беларусью”, если эксперты этой инициативы сосредоточатся лишь на предложении законодательных правок.

“Часть белорусской оппозиции страдает правовым фетишизмом: ей кажется, что если внести в Избирательный кодекс хоть какие-то нормы, то все изменится”, — отмечает Юрий Чаусов.

Между тем любая реформа избирательного законодательства сама по себе не решит для страны вопрос свободных выборов. А значит, демократам мало биться за букву закона. Важнее заняться созданием такой ситуации, когда закон начнет работать.

Артем ШРАЙБМАН.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Павел МАЛАШЭВІЧ:

«Магчыма, Азаранка атруцілася...»

На гэтым тыдні беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка на турніры ў Токіа нечакана прайграла амерыканцы Вінус Уільямс. На корце Віка была непадобная сама на сябе. Што здарылася?



Сама спартсменка пасля матча паскардзілася на здароўе. Маўляў, апошнія дні вельмі дрэнна сябе адчувала. За каментарыем “Народная Воля” звярнулася да ўрача зборнай Беларусі па тэнісе **Паўла МАЛАШЭВІЧА.**

— На турніры я не прысутнічаў, таму магу толькі тэарэтычна меркаваць аб тым, што адбылося, — кажа суразмоўца. — Разумееце, у Японіі вельмі спецыфічны клімат. Вільготнасць, духата, розніца ў часе... Хоць спартсмены і загартаваныя людзі, аднак у такіх умовах ідзе дадатковая нагрузка. Могуць з’явіцца праблемы са страўнікам, бо нават нармальныя прадукты не кожны арганізм “перапрацуе”. Калі з’еў нешта больш цяжкае, чым садавіна, гэта затым ляжа каменем у страўніку. Павышаецца верагоднасць харчовага атручэння. Адным словам, на здароўі Вікі магла адбіцца акліматызацыя. А можа быць, і атруцілася.

— Наколькі вядома, перад турнірам Вікторыя Азаранка прыязджала ў Мінск.

— Так, мы сустракаліся, а сёння беларускія тэнісісты накіроўваюцца на турнір у Пекін. Думаю, з Вікай усё будзе нармальна.

Алесь СІВЫ.

СЛЫШАЛИ?

Вводятся изменения в порядок прохождения техосмотра

Произойдет это с 1 ноября. Изменения связаны с введением в действие двух Государственных стандартов Республики Беларусь, касающихся оценки вредного воздействия автомобилей на окружающую среду.

С инициативой выступило Министерство природы, а УП “Белтехосмотр” привело нормы техосмотра в соответствие с вышедшими стандартами. Все бензиновые и дизельные авто будут разделены на экологические классы от самого низкого, первого, до самого высокого, пятого. В новых автомобилях производитель сразу указывает такую информацию. Если таких данных нет, то автомобилям присваивается самый низкий экологический класс. Госавтоинспекция будет обязана указывать эти данные в регистрационных документах, убедившись, что экологические параметры соответствуют предельно допустимым значениям.

Для автомобилей-такси ужесточат требования к внешнему виду. Под контроль попадут опознавательный фонарь, полосы желтого цвета на боковых поверхностях кузова, отличительный знак обслуживания, регистрационные знаки, пассажирские двери, противооткатный упор, таксометр, механизмы регулировки сидений и спинок сидений пассажиров, состояние салона и прочего оборудования, находящегося в салоне транспортного средства.

Кроме того, теперь квадроциклы, мопеды и приравненные к ним транспортные средства будут обязательно проходить техосмотр.

СТАЛІЦА

МКАД абгародзяць

Работы пачнуцца ўжо ў бліжэйшыя месяцы.

У Мінгарвыканкаме агучылі структурную праграму па абнаўленні МКАД. Сярод іншых пунктаў — будаўніцтва дарожнай агароджы з унутранага і знешняга бакоў кальцавой, па 56,4 км з абодвух бакоў.


“Яна будзе выглядаць прыкладна так, як і ўжо ўстаноўленыя (напрыклад, на пуцеправодах) металічныя канструкцыі крыху больш за метр у вышыню, — распавялі журналістам у Мінскай ДАІ. — *Агароджа стане перашкодай для жывёл, пешаходаў-парушальнікаў, а таксама не дасць аўтамабілям вылецець у кювет ці ўрэзацца ў слуп у выпадку аварыйнай сітуацыі. Таксама агароджа, якая ўжо ёсць пасярэдзіне МКАД, будзе ўдасканалена: з’явяцца высокія канструкцыі (у выглядзе высокіх бэлек), якія не дадуць асляпляць кіроўцаў святлом фар сустрэчнага патоку. Праз іх практычна немагчыма будзе перабрацца пешаходу”.*

Праграма разлічана на 2014—2016 гады.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Названа прычына смерці прадзюсара Ланской

Дзмітрый Баранаў памёр ад сардэчна-сасудзістага захворвання.




Следчы камітэт Беларусі завяршыў праверку па факце смерці гендырэктара прадзюсарскага цэнтра “Спамаш” Дзмітрыя Баранава. Фактаў, якія сведчылі б аб здзяйсненні супрацьпраўных дзеянняў у дачыненні да Дзмітрыя Баранава, не ўстаноўлена. Таксама высветлілася, што цэнтральны замок машыны прадзюсара, дзе яго знайшлі мёртвым, быў зачынены знутры.

Прадзюсар спявачкі Алены Ланской памёр у жніўні гэтага года. Яму было толькі 38 гадоў...

БОЛЬШАЯ ПОЛИТИКА

Спецвояж

На целых 12 дней прилетел в Поднебесную венесуэльский президент с официальным визитом. Такая продолжительность визита тянет на рекордный срок для современной дипломатии. Но это еще не все рекорды.



Планируется к подписанию порядка 400 (!!!) документов по двустороннему сотрудничеству, — торжественно декларирует венесуэльское телевидение. Для чего прибыла и делегация из 250 чиновников. Конечно, не только договоры, но и большей частью менее важные соглашения — меморандумы и протоколы о намерениях — будут подписаны. Самые главные документы, касающиеся китайских инвестиций на 14 млрд долларов в нефтедобычу, 700 миллионов на разработку одного из крупнейших в мире месторождений золота и кредита в 5 миллиардов на "строительство социализма XXI века", уже подписаны. Страна с богатейшими запасами нефти остро нуждается в деньгах: строительство социализма по кубинско-советскому лекалу — дело скорее затратное, нежели прибыльное.

У многих венесуэльцев этот визит вызвал негодование и возмущение. Прилет главы государства на самолете кубинской авиакомпании Cubana видела вся страна в прямом репортаже о прибытии в Китай. Почему президент независимой страны прилетел на самолете под чужим флагом? Где самолет, которым пользовался покойный команданте? А расходы по визиту составят два миллиона долларов. В этом году президент "из простых рабочих" уже потратил на свои визиты более 8 миллионов долларов. Страна еще больше залазит в долговую яму. По оценкам независимых экономистов, в стране оставалось свободной валюты на оплату недельной потребности в продуктах питания, которых импортируют почти на 70 процентов. Ситуация в современной Венесуэле покруче любых замесов в самом популярном латиноамериканском сериале из трехсот серий. Судите сами. Незадолго до визита в Китай в стране произошло массовое отключение электроэнергии, в 14 из 24 штатов страны не было света! Более половины страны остановилось и погрузилось во мрак. Затем произошла резня в одной из тюрем — банды оспаривали центральный проход в тюрьме. Результат разборки — два десятка трупов. Кстати, Венесуэла — единственная страна в мире, где существует Министерство пенитенциарных (тюремных) дел, и возглавляет его женщина. Одновременно строящая социализм Венесуэла решила выйти из Соглашения по правам человека, чтобы не отвлекаться на "надуманные" проблемы.

Перед прибытием в Китай Мадуро залетел к братьям Кастро за консультациями, отчего потом и произошло дипломатическое замешательство — США не пропускают через свое воздушное пространство кубинские самолеты. Негодующие венесуэльцы часто называют своего президента "кубинской криатурой". "У нас не хватает продуктов питания, нет туалетной бумаги, каждый венесуэлец уже должен Китаю порядка 200 тысяч долларов по кредитам, но "у нас есть Родина", — зло передразнивают граждане официальную пропаганду. — Мы строим ужасный социализм, пора разучивать гимн на китайском языке! Раньше мы должны были МВФ, а теперь — Китаю, и куда большие суммы!

Китайские коммунисты-макроэкономисты, или коммунисты-капиталисты (кому как нравится), продуманно расширяют свое присутствие в этой стране, чьи непутевые руководители все больше погрязают в долгах. Это при том, что за последние 10 лет цена нефти была рекордно высокой от 100 долларов за баррель и выше. Кстати, только в счет погашения своих долгов перед Китаем туда отправляется ежемесячно столько нефти, сколько белорусы с венесуэльцами добывают за год! За полгода страна выплатила внешних долгов почти на три миллиарда, что на 345% больше, чем за аналогичный период прошлого года! И буквально в эти дни Венесуэла должна выплатить по бондам, размещенным за рубежом, 1,6 миллиарда долларов. На завистъ белорусским союзникам Китай поставит туда 2000 автобусов и организует их совместное производство, отправит 2 миллиона единиц бытовой техники для того жилья, что строят там китайцы. Из китайских деталей собирают сотни тысяч компьютеров и миллионы мобильников в Венесуэле. Открывается вторая линия по производству легковушек "Chery" на 18 тысяч машин в год. Такими темпами, глядишь, китайский станет вторым государственным языком. Для защиты социализма закуплены китайские радары и самолеты. Китайские силовики окажут содействие во внутренних делах. Под руководством любящих свой народ Чавеса и Мадуро страна оказалась на 165-м месте из 174 по коррумпированности. На слуху недавний скандал с кокаином из Венесуэлы: французский самолет, прибывший из Каракаса, привез на борту 30 чемоданов с кокаином общим весом 1,3 тонны на сумму 200 миллионов евро. Это рекордный улов французской полиции и четвертый по весу в Евросоюзе.

В том, что в стране все хорошо и будет еще лучше, настойчиво убеждает своих граждан президент Мадуро — по подсчетам независимой организации "Гражданский мониторинг", в период с июня на начало сентября венесуэльского президента показывали по телевидению по полтора часа в день, 160 часов эфирного времени. Непросто объяснить, почему в стране инфляция 45% в текущем году, что обеспеченность многими продуктами составляет лишь 41% от потребности, а из проверенных 100 магазинов в 70 нет туалетной бумаги, в 81 — молока и масла.

Китай протянул руку помощи едва не протягивающим ноги строителям социализма, стране, имеющей самые большие в мире разведанные запасы нефти. В декабре в Венесуэле состоятся муниципальные выборы. Лидеры боливарианской революции получили еще один "кусочек китайского сыра", которого надолго не хватит, а расплачиваться будет вся страна.

Леонид ДОКУЧАЕВ.

КОРРУПЦИЯ

Китай: суд приговорил известного политика Бо Силая к пожизненному заключению

Суд КНР признал бывшего члена политбюро Центрального Комитета Коммунистической партии Китая Бо Силая виновным в получении взяток, присвоении государственных средств и злоупотреблении служебным положением с 1999-го по 2012 год и приговорил к пожизненному лишению свободы, сообщает 22 сентября РИА "Новости".

На суде бывший партийный руководитель китайского мегаполиса Чунцин, которому в июле исполнилось 64 года, отказался от своих признаний, сделанных во время внутрипартийного расследования и на стадии предварительного следствия, заявив, что они были даны под давлением.

Судья оценила ущерб, который нанес Бо Силай национальным интересам и китайскому народу, в 20 миллионов юаней (3,2 миллиона долларов).

МОНИТОРИНГ

В мире — новый лидер по производству сырья для кокаина

По данным нового доклада ООН, Республика Перу стала главным производителем листьев коки.

Плантации коки в Перу в прошлом году покрыли 60 тыс. га — на 20% больше, чем у предыдущего лидера в этой сфере, Колумбии, где политика по уничтожению урожая оказалась очень успешной.

Не ясно, какое количество листьев коки используется для легального производства чаев и других продуктов.

Перу, Колумбия и Боливия остаются крупнейшими производителями кокаина в мире.

СВОИМИ ГЛАЗАМИ



Как я путешествовала по Италии

(Окончание. Начало в №75.)



Венеция: любовь и смерть

Венеция — город на воде, и расстояния здесь преодолеваются либо пешком, либо на маленьком пароходике. Поэтому, чтобы добраться с острова на остров, иногда нужно более двух часов.

Венеция — наверное, единственный город в мире, где нет наземного транспорта. Ни машин, ни троллейбусов, ни трамваев и велосипедов. Вместо такси — катера, вместо лимузинов — роскошные гондолы.

Мир колес остается позади, мы о нем забываем. Бродим по тесным венецианским улочкам. В витринах — карнавальные маски, муранское стекло... Десятки сортов пасты (с какао, лососем, шпинатом, лимоном, свеклой и даже чернилами каракатицы), местное печенье в форме гондолы.

